**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за снежань 2022 г.

У рамках акцыі «Полезные каникулы» ў бібліятэках раёна з 25 снежня пачаўся шэраг мерапрыемстваў для дзяцей і падлеткаў: квест-гульні, конкурсы, віктарыны, пасяджэнні аматарскіх клубаў і шэраг іншых мерапыемстваў. Акцыя «Полезные каникулы» працягнецца да 8 студзеня 2023 года.

## Мерапрыемствы ў рамках Года гістарычнай памяці

**8 снежня**

У рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» і Года гістарычнай памяці ў цэнтральнай раённай бібліятэцы для студэнтаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа праведзена гістарычная гадзіна «Свеча памяти жертвам геноцида», прымеркаваная да Міжнароднага дня памяці ахвяр злачынства генацыду, ушанавання іх годнасці. У мерапрыемстве прыняла ўдзел памочнік пракурора Кобрынскага раёна Яўгенія Марчук.

ЦРБ, 57 чал.

**14 снежня**

У цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла гадзіна памяці «Концлагеря: чтобы история не повторилась». Пракурор Кобрынскага раёна Сергей Мяшечка распавёў пра трагічныя дні Вялікай Айчыннай вайны, пра жахлівыя злачынствы, якія чынілі нямецка-фашысцкія захопнікі, пра генацыд беларускага народа, інфармацыя аб якім размешчана ў кнізе «Генацыд беларускага народа». Удзельнікамі мерапрыемства сталі навучэнцы старэйшых класаў гімназіі г. Кобрына.

ЦРБ, 42 чал.

**27 снежня**

Раённы турнір па інтэлектуальнай гульні «Што? Дзе? Калі?», прысвечаны Году гістарычнай памяці, сабраў у Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы 6 каманд працуючай моладзі. Гульня складалася з 6 блокаў. Найлепшай стала каманда з Кобрынрайгаза. Спонсарамі гульні сталі ОАО «Кобрынскі МСЗ» і кафэ «Піца – Італьяна».

ЦРБ, 41 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 снежня**

Залеская публічная бібліятэка сумесна з ЦКД правялі духоўна-асветніцкія чытанні «Духовная книга – назидательное чтение» з удзелам святароў храма Пятра и Паўла г. Кобрына. Прысутныя падзяліліся ўражаннямі аб прачытанных праваслаўных кнігах і часопісах.

Залеская п/б, 120 чал.

**2 снежня**

Гадзіна здароў'я «СПИД без мифов и иллюзий» адбылася ў цэнтральнай раённай бібліятэцы ў рамках інфармацыйна – асветніцкага праекта «Здоровая молодежь – здоровая нация». У мерапрыемстве прыняла ўдзел урач - эпідэміёлаг Кобрынскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ірына Ператолчына і член литаратурного клуба «ПоэтиКо», капітан міліцыі ў адстаўцы Зінаіда Навасад. Удзельнікамі гадзіны здароў'я былі старшакласнікі гімназіі г. Кобрина і студэнты вучылішч.

ЦРБ, 68 чал.

**2 снежня**

“Способности ограничены – возможности безграничны” - пад такой назвай у інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі прайшла гадзіна мудрасці і ўвагі, гасцямі якога сталі падапечныя аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН. Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі гасцей з біяграфіямі людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія дабіліся поспеху ў розных сферах жыццядзейнасці. Завяршылася мерапрыемства праглядам відэароліка “Живите, любите” вакальнай групы “Фантазія” ЦРБ .

ЦРБ, 17 чал.

**З 02.12. па 10.12** у цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла **Дэкада прававых ведаў**, прысвечаная Дню правоў чалавека и 20-годдзю стварэння ПЦПІ. У рамках Дэкады прававых ведаў экспанаваўся цыкл выстаў, якія шырока асвятлялі стан і рэалізацыю правоў чалавека ў сучасным свеце.

**2 снежня**

Дэкада прававых ведаў пачалася з кансультацый «Пытаемся ў натарыуса», якія прайшлі на базе Публічнага цэнтра прававой інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі. Кансультацыі адбыліся ў рамках сумеснага праекта ПЦПІ Кобрынскай ЦРБ і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Бібліятэка і натарыят: узаемавыгаднае супрацоўніцтва». Кансультацыйная дапамога жыхарам горада была аказана натарыусам натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна Надзеяй Дашук.

ЦРБ, 14 чал.

**7 снежня**

У рамках Дэкады прававых ведаў ў цэнтральнай бібліятэцы прайшоў Дзень прававой асветы “Планета прав”. Ганаровымі гасцямі Дня былі: спецыяліст рэгіянальнага цэнтра прававой інфармацыі Брэсцкай вобласці В. А. Галавей, загадчык юрыдычнай кансультацыі Кобрынскага раёна Брэсцкай абласной калегіі адвакатаў А. В. Мінгазава, памочнік пракурора Кобрынскага раёна Я. Р. Марчук. Запрошаныя з'яўляліся адначасова і выступоўцамі, і членамі журы. Удзельнікамі мерапрыемства сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа і Кобрынскага дзяржаўнага каледжа

сферы абслугоўвання, якія актыўна ўдзельнічалі ў пазнавальна-гульнявым турніры, прававой віктарыне, конкурсах, сітуацыйных заданнях, гумарыстычных задачах. Грамату пераможцы ад ПЦПІ атрымаў каледж сферы абслугоўвання. Спецыяліст РЦПІ Брэсцкай вобласці Вольга Галавей уручыла кожнаму члену каманды пераможцы прызы і падарункі ад Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

ЦРБ, 61 чал.

**4 снежня**

У Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся паказ гумарыстычнага спектакля «Страсці – мардасці, ці…», падрыхтаванага аматарскім тэатрам–студыяй «Піражок». Яркія, завадныя самадзейныя артысты чарговы раз даказалі свайму гледачу, што для творчасці няма перашкод: ні ўзрост, ні грамадскія перыпетыі, ні хваробы творчым людзям не перашкода. Кожная пастаноўка - гэта не проста гумар, а цікавая тэма, якая падаецца з сатырычнай ноткай.

ЦРБ, 55 чал.

**18 снежня**

У бібліятэцы прайшла гадзіна духоўнасці «О христианском благочестии». Бібліятэкар аформіла кніжную выставу «Через православную книгу к духовности» і правяла яе агляд. Запрошаны іерэй Сергій, настаяцель храма Архістратыга Міхаіла распавёў прысутным аб значэнні кнігі ў духоўным і свецкім жыцці, адказаў на пытанні, якія ўзніклі ў прысутных.

Навасёлкаўская п/б, 43 чал.

**23 снежня**

У ЦРБ прайшла творчая лабараторыя «Библиотека – территория творчества», удзельнікамі якой сталі супрацоўнікі публічных бібліятэк горада і раёна. У рамках вучобы кадраў былі разгледжаны пытанні рэкламы кнігі пры дапамозе буклукаў, павышэння якасці правядзення мерапрыемстваў з выкарыстаннем музычнага і тэатральнага суправаджэння, укаранення новых форм работы з карыстальнікамі. Вакальныя здольнасці паказала вакальная гуппа ЦРБ «Фантазия», аматарскі тэатр - студыя «Пирожок» прадэманстраваў тэатральныя магчымасці, прадставіў гумарыстычны спектакль «Страсці – мардасці, ці…».

ЦРБ, 28 чал.

Выканаўца Галавейка Т. А.
Тэл. 3 85 81